**ВОДГУК**

на аўтарэферат дысертацыі
Бяляевай Святланы Сяргееўны
«Архитектурный декор традиционного
народного жилища Центральной Беларуси»,
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное
мастацтва і архітэктура

Дысертацыя С. С. Бяляевай прысвечана цікавай і навукова значнай тэме, якая да гэтага часу не была аб'ектам комплекснага даследавання ў айчынным мастацтвазнаўстве. Аўтарэферат пераканаўча адлюстроўвае яе навізну і актуальнасць. Сфармуляваныя задачы не выклікаюць пярэчанняў. Аўтарэферат добра структураваны, напісаны выразнай і зразумелай мовай, высновы лагічныя, літаратура адпавядае заяўленай тэматыцы.

Суіскальнікам дакладна вывучана і асэнсавана своеасаблівасць архітэктурнага дэкору на тэрыторыі гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна – Цэнтральнай Беларусі, адзначаны рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці аздаблення ліштваў, шчытоў драўляных дамоў, выдзелены арэалы распаўсюджвання архітэктурнага дэкору (Мінскі, Маладзечанска-Капыльскі, Слуцка-Любанскі, Чэрвенска-Барысаўскі і Асіповіцка-Бабруйскі), разгледжана сімволіка-вобразная сістэма ўпрыгожвання жылля.

Аўтарэферат дае дастатковае ўяўленне аб паўнаце крыніцазнаўчай базы дысертацыі, пры гэтым асаблівую каштоўнасць уяўляюць палявыя матэрыялы аўтара, сабраныя падчас экспедыцый не толькі па тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі, але і ў іншых рэгіёнах рэспублікі.

Структура дысертацыі адпавядае пастаўленай мэце і садзейнічае вырашэнню сфармуляваных задач.

Да найболей значных вынікаў дысертацыі можна аднесці наступныя:

– выяўленне агульных заканамернасцяў і дынамікі развіцця архітэктурнага дэкору традыцыйнага жылля рэгіёна;

– даследаванне асаблівасцей асноўных канструктыўна-дэкаратыўных кампанентаў традыцыйнага жылля Цэнтральнай Беларусі;

– вывучэнне мастацкай і сімволіка-вобразнай сістэмы жылля разглядаемага рэгіёна;

– вылучэнне лакальных асаблівасцей архітэктурнага дэкору традыцыйнага жылля Цэнтральнай Беларусі.

Такім чынам, аўтарэферат і 31 публікацыя С. С. Бяляевай адпавядаюць зместу дысертацыі. У іх адзначаецца актуальнасць, тэарэтычнае і практычнае значэнне дысертацыйнага даследавання і, мяркуючы па аўтарэферацe, навуковае даследаванне адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, што прад'яўляюцца да дысертацый на суіскание вучонай ступені кандыдата навук. Аўтар дысертацыі, Бяляева Святлана Сяргееўна, безумоўна, заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 - выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дактарант ІМЭФ НАН Беларусі А. М. Нароўская